(ознакомительный фрагмент)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Дзяржаўная навуковая ўстанова
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
імя К.КРАПІВЫ"

УДК 7.048(476)

БОХАН
Алена Сяргееўна

# ГЕАМЕТРЫЧНЫ АРНАМЕНТ ТРАДЫЦЫЙНЫХ БЕЛАРУСКІХ ТКАНІН: СЕМАНТЫКА І СТЫЛІСТЫКА

17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

Мінск, 2006

**Навуковы кіраўнік** – доктар мастацтвазнаўства, прафесар, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі"
**Я.М.Сахута**

Афіцыйныя апаненты – доктар мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела архітэктуры ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі"
**Т.В.Габрусь**

кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі"
**М.М.Віннікава**

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Абарона адбудзецца "19" студзеня 2007 г. у 16⁰⁰ на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.42.02 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп.2, к. 301.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі".

Аўтарэферат разасланы "8" снежня 2006 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства Н.А.Юўчанка

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.*** Даследаванне з'яўляецца часткай навуковай праграмы, якую распрацоўвае кафедра гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у межах дзяржаўнай праграмы "Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года" ("Культура") у адпаведнасці з Перспектыўным планам навукова-даследчай і творча-выканальніцкай работы БДАМ на 2000-2005 г., зацверджаны 29.02.2000 (Пратакол пасяджэння Савета Акадэміі №2). Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы фундаментальных даследаванняў кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у межах планавай тэмы "Прафесійная мастацкая творчасць і нацыянальная мастацкая школа Беларусі: праблемы развіцця і захавання самабытнасці" (2006—2010 г.).

***Мэта і задачы даследавання.*** Асноўная мэта даследавання – выяўленне характэрных рысаў і раскрыццё сутнасных заканамернасцяў развіцця арнаментальнай традыцыі і прынцыпаў формаўтварэння кампазіцый геаметрычнага арнаменту беларускага народнага тэкстылю. Азначаная мэта абумовіла наступныя задачы:

- вызначыць этапы развіцця традыцыі арнаментавання тэкстылю;
- выявіць паходжанне асноўных элементаў арнаментыкі традыцыйных мастацкіх тканін;
- класіфікаваць асноўныя элементы геаметрычнага арнаменту традыцыйных беларускіх тканін;
- вызначыць стылістычныя адметнасці кампазіцый тэкстыльнай арнаментыкі;
- акрэсліць рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці прыёмаў арнаментацыі традыцыйных беларускіх тканін.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца тканы і вышываны геаметрычны арнамент традыцыйнага беларускага тэкстылю XIX – XX стст. Крыніцамі матэрыялу для даследавання сталі археалагічныя помнікі, гістарычныя і этнаграфічныя матэрыялы, якія дазваляюць звярнуцца да ранніх перыядаў існавання арнаменту і выявіць заканамернасці яго развіцця. Прадметам даследавання з'яўляюцца генезіс, семантычныя і стылістычныя асаблівасці геаметрычнай арнаментыкі традыцыйных беларускіх тканін.

***Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:***

1. Геаметрычны арнамент беларускіх тканін – адна з самых архаічных праяў традыцыйнай культуры Беларусі, якая бярэ пачатак у першабытным мастацтве. Арнаментальныя матывы тэкстылю ўзніклі да таго, як узнік сам тэкстыль, а семантычная аснова старажытных сімвалаў была прычынай іх выкарыстання і ўстойлівага ўжывання.

2. Шырокае выкарыстанне арнаментаваных тканін хатняй вытворчасці ў рытуалах і побыце беларусаў ва ўсе гістарычныя перыяды спрыяла непарыўнасці традыцыі і трываласці канонаў арнаментальнага аздаблення тэкстылю, якія дажылі да сучаснасці. Арнаментальныя сімвалы, фармальна не змяняючыся, мянялі з цягам часу змест. Паступова яны сталі сведчыць пра прыналежнасць да традыцыі продкаў, зрабіліся абярэгамі. Арнаментальныя кампазіцыі тэкстылю XIX – XX стст. захавалі рудыменты старажытнай культуры.

3. На падставе аналізу паходжання асноўных сімвалаў арнаментальнай сістэмы традыцыйных тканін можна сцвярджаць, што дадзеныя, якімі могуць аперыраваць сучасныя даследчыкі, дазваляюць рэканструяваць агульныя пытанні архаічнага разумення светабудовы: каардынаты ў прасторы і часе, еднасць супрацьлеглых пачаткаў, сувязь рэальнай і ірэальнай прасторы. Некарэктным з'яўляецца літаральнае тлумачэнне пэўных арнаментальных кампазіцый, заснаванае толькі на ўяўленнях і інтэрпрэтацыях сучаснага чалавека.

4. Асноўныя прыёмы ў геаметрычным арнаменце беларускіх традыцыйных тканін – паўтор, інверсія, сіметрыя. У аздабленні тэкстылю ўжываюцца тры вядучыя прынцыпы пабудовы арнаментальных кампазіцый: бардзюры, сятчастыя структуры, медальёны. Месца размяшчэння арнаментальных кампазіцый на традыцыйным тэкстылі абумоўлівалася як стварэннем пэўнага мастацкага вобразу, так і семантычнымі функцыямі.

5. Рэгіянальная разнастайнасць аздаблення тканін, якая вынікала з мясцовых традыцый, распаўсюджаных тэхнік выканання, традыцыйнай сыравіны, найбольш праяўляецца ў перавазе пэўных кампазіцыйных прыёмаў пабудовы, а не ў складзе арнаментальных элементаў. Нацыянальная і рэгіянальная своеасаблівасць арнаменту беларускіх тканін дазваляе яму займаць адно з найважнейшых месцаў у традыцыйным мастацтве Беларусі і лічыцца значным этнакультурным фактарам.

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Увесь аб'ём даследаванняў – вынік уласных навуковых пошукаў аўтара. Інфармацыйная база даследавання сфарміравана на аснове сістэматызацыі і тэарэтычнага асэнсавання, абагульнення апублікаваных крыніц, аналізу візуальных матэрыялаў.

Работа з'яўляецца першым комплексным разглядам стылістыкі і семантыкі геаметрычнага арнаменту беларускіх традыцыйных тканін. Прасочана традыцыя геаметрычнай арнаментыкі беларускага тэкстылю ад старажытнасці да пачатку XX ст.; на беларускім матэрыяле геаметрычная арнаментыка тканін разглядаецца як семіятычная сістэма; створана класіфікацыя элементаў арнаментальных кампазіцый; выяўлены прынцыпы будовы арнаментальных кампазіцый беларускага традыцыйнага тэкстылю; вызначаны асаблівасці кампазіцыйных прыёмаў у стварэнні арнаментальнага тэкстыльнага дэкору, характэрныя для асобных рэгіёнаў краіны; удасканалены тэрміналагічны апарат для апісання кампазіцыйных прыёмаў традыцыйных беларускіх тканін.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Дысертацыйнае даследаванне абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання прайшлі апрабацыю на міжнароднай навуковай канферэнцыі «Ручнік у прасторы і часе» (Мінск, 1998), канферэнцыі «Семантыка і формы традыцыйных народных мастацтваў ад старажытнасці да нашых часоў» (Мінск, 1998), рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь – мая песня» (Мінск, 1998), рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Сучасная літаратурна-мастацкая крытыка і СМІ» (Мінск, 2001), XXII Міжнародным медыявістычным семінары «Koniec i poczatek. Od poganstwa do chrzescijanstwa» Познаньскага Таварыства Навук, Інстытута гісторыі мастацтва ПАМ (Познань, 2001), рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальная мастацкая школа: праблемы трансфармацыі на сучасным этапе» (Мінск, 2002), міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі

II Няфёдаўскія чытанні (Мінск, 2005), II міжнароднай навуковай фальклорна-этналінгвістычнай канферэнцыі «Комплекснае даследаванне фальклору і этнакультуры Палесся» (Мінск, 2005), рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Праблемы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і архітэктуры ў кантэксце славянскіх культур у сучасным свеце» (Мінск, 2005), міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Актуальные проблемы искусства и современной художественной школы Беларуси в условиях глобализации культуры» (Мінск, 2006).

***Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.*** Па тэме дысертацыі аўтарам апублікавана 10 работ, сярод якіх – 5 навуковых артыкулаў, 1 вучэбны дапаможнік, 4 публікацыі ў матэрыялах канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 95 старонак.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае чатыры главы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадатка – альбома ілюстрацый. Поўны аб'ём дысертацыі складае 195 старонак, з іх 69 старонак займае дадатак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 341 найменне. Альбом ілюстрацый уключае 127 адзінак ілюстрацыйнага матэрыялу.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** акрэсліваецца значэнне тэкстыльнага геаметрычнага арнаменту ў гісторыі беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы.

У першай главе **"Гістарыяграфія пытання і тэарэтычныя прынцыпы даследавання"** разгледжаны асноўныя этапы вывучэння праблемы, выяўлены нявырашаныя пытанні і распрацаваны тэарэтычныя напрамкі даследавання. У раздзеле 1.1 **"Гістарыяграфія пытання"** ахарактарызаваны асноўныя публікацыі, у якіх закраналіся пытанні даследавання. Яшчэ ў XVIII ст. складаліся праграмы экспедыцый па вывучэнні народнага мастацтва ўсходніх славян. Штуршок для зацікаўлення менавіта праблемай арнаменту ў канцы XIX—пачатку XX ст. далі працы рускіх даследчыкаў В.Стасава, Ф.Буслаева. Арнамент традыцыйнага адзення прыцягваў увагу даследчыкаў беларускай традыцыйнай культуры М.Нікіфароўскага, І.Сербава, А.Смоліча, А.Астрэйка і інш. Аднак, навукоўцы канца XIX – пачатку XX ст. разглядалі арнаментацыю толькі як адзін з распаўсюджаных спосабаў аздобы тканін. Разуменне традыцыйнай арнаментыкі як адной з важных этнавызначальных прыкмет узнікла пазней. М. Шчакаціхін быў адным з першых, хто ў канцы 1920-х гадоў звярнуў увагу на падабенства геаметрычнага арнаменту старажытных ювелірных вырабаў і аздобаў традыцыйнага беларускага тэкстылю.

Гістарычна абумоўленыя сувязі і доўгачасовае існаванне ў адной дзяржаве вяло да перакрыжавання інтарэсаў вучоных. На матэрыяле з этнічных беларускіх тэрыторый працавалі расійскія навукоўцы А.Клятнова, М.Левінсон-Нячаева, Г.Маслава. Іх навуковыя даследаванні закранaлі пытанні паходжання і семантыкі арнаменту.

З сярэдзіны 1950-х гадоў праблематыка вывучэння беларускага традыцыйнага арнаменту набыла істотна новае гучанне. Арнамент пачаў разглядацца як адметная з’ява ў беларускім мастацтве. Да даследавання традыцыйнай арнаментыкі

па канцах ці запаўняе ўсю паверхню палатна, у адзенні арнамент падкрэслівае ці вызначае архітэктоніку прадмета.

У арнаментальных кампазіцыях выкарыстоўваюцца асноўныя прыёмы: паўтор, чаргаванне, сіметрыя, інверсія. Структура кампазіцыі абумоўліваецца пэўнай арганізацыяй арнаментальных рапортаў і элементаў у рапорце. Суадносіны элементаў з'яўляюцца адной з асноў будовы арнаментальнай кампазіцыі традыцыйнага беларускага тэкстылю.

У рапортах арнаментальных кампазіцый прысутнічае як статычная, так і дынамічная кампаноўка элементаў. Па запоўненасці элементамі структуры рапортаў можна падзяліць на празрыстыя, шчыльныя і з пераплеценымі элементамі.

Для геаметрычнага арнаменту беларускіх тканін уласцівы тры асноўныя прынцыпы кампазіцыйнай пабудовы: бардзюры, сятчастыя кампазіцыі і медальёны. Найбольш пашыраны спосаб кампанавання элементаў – бардзюр. У такіх лінейных кампазіцыях можна вылучыць два тыпы рытмічных заканамернасцяў: метрычную і рытмічную.

Каларыстычнае вырашэнне, рытмічны строй і прапорцыі ствараюць арыгінальныя мастацкія вобразы арнаментальных кампазіцый беларускага тэкстылю [7,10].

5. Праяўленне рэгіянальных асаблівасцяў арнаментальнага дэкору беларускіх тканін заключаецца ў шматлікіх варыяцыях спалучэнняў кампазіцыйных прыёмаў стварэння арнаментальнага дэкору. Адна з самых трывалых характарыстык геаметрычнага арнаменту традыцыйнага беларускага тэкстылю – склад арнаментальных элементаў.

Шматлікімі стылістычнымі варыяцыямі вызначаюцца гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Характэрныя асаблівасці дэкору тканін Заходняга Палесся – гарызантальная скіраванасць кампазіцый, ужыванне складанага рытму ў кампаноўцы бардзюраў, шырокае выкарыстанне шасціпрамянёвых узораў і дробна распрацаванага рамбічнага арнаменту; Усходняга Палесся – спалучэнне сятчастых структур з бардзюрамі і бардзюры-аблямоўкі, выкарыстанне вялікай колькасці салярнай сімволікі, рознамаштабнасць элементаў, актыўнае ўвядзенне ў каларыт чорнага колеру; Падняпроўя – шырокае ўжыванне ўсіх асноўных прынцыпаў кампазіцыйнай пабудовы арнаменту (сетка, бардзюр, медальён), выкарыстанне такіх архаічных сімвалаў як свастыка і грабенчаты ромб, асіметрычныя матывы; Паазер'я – тэндэнцыя да шмат'яруснага дэкору (у тым ліку, папулярнасць кампазіцый "Сусветнае Дрэва"), шырокае ўжыванне ромбаў, зорак, крыжоў; Панямоння – вертыкальны кірунак кампазіцый, распаўсюджанне разетак і васьміканцовых зорак; Цэнтральнай Беларусі – аддавочная перавага гарызантальнага напрамку, шчыльнае размяшчэнне рапортаў, панаванне рамбічных матываў.

Устойлівае бытаванне архаічных элементаў арнаменту і традыцыйныя кампазіцыйныя прыёмы на ўсёй тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца доказам пераемнасці мастацкай традыцыі і этнічнай аднароднасці насельніцтва краіны. Разгледжаныя матэрыялы дазваляюць гаварыць пра багацце семантычнага напаўнення і вялікую эстэтычную каштоўнасць арнаменту традыцыйных беларускіх тканін [1,9,10].

# СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ

**Артыкулы ў навуковых часопісах:**

**1.** Законнікава, А.С. Гармонія рытмікі ў часе / А.С. Законнікава // Мастацтва. – 1997. – № 2. –С. 73—75.

**2.** Законнікава, А.С. Мова народных тканін / А.С. Законнікава // Мастацтва. – 1998. – № 10. –С. 26—29.

**3.** Законнікава, А.С. Сам час выткаў той сувой / А.С. Законнікава // Мастацтва. – 1999. – № 9. – С. 43—45.

**4.** Законнікава, А.С. Геаметрычны арнамент беларускіх тканін / А.С. Законнікава // Весці АН Беларусі. Сер. грамад. навук. – 2000. – С. 104—109.

**5.** Бохан, А.С. Арнаментальная традыцыя беларускага народнага тэкстылю / А.С. Бохан // Беларускі гістарычны часопіс. –2005. – № 12. – С. 28—33.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый:**

**6.** Законнікава, А.С. Арнамент беларускіх ручнікоў як увасабленне архаічных светапоглядаў / А.С. Законнікава // Ручнік у прасторы і часе: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ.канф. 19—20 ліст.1998 г./Агул. Рэд Лабачэўская В.А. – Мінск: БелІПК, 2000. – С.117—120.

**7.** Бохан, А.С. Вывучэнне кампазіцыйных асаблівасцяў традыцыйных беларускіх тканін у межах дысцыплін гісторыка-мастацтвазнаўчага цыкла / А.С. Бохан // Нацыянальная мастацкая школа: праблемы трансфармацыі на сучасным этапе: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 23—24 мая 2002 г. / Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. – Мінск, 2003. – С.25—28.

**8.** Бохан, А.С. Праблемы вывучэння арнаменту традыцыйнага беларускага тэкстылю / А.С. Бохан //II Няфёдаўскія чытанні. З подзвігам у сэрцы: тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім мастацтве XX—пачатку XXI стагоддзя. Зб. матэрыялаў Міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі (Мінск, 24—25 сакавіка 2005 г.). –Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, 2005. – С. 95—100.

**9.** Бохан, А.С. Арнаментальная традыцыя тэкстылю Заходняга Палесся / А.С. Бохан // Комплекснае даследаванне фальклору і этнакультуры Палесся: матэрыялы II Міжнар. навук. фальклорна-этналінгвіст. канф., 14-15 крас. 2005 г., Мінск/ рэдкал. Васіль Ліцьвінка (уклад.) [і інш.]. –Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2005. – С. 68—72.

**Навукова-метадычнае выданне:**

**10.** Бохан, А.С. Геаметрычны арнамент традыцыйных беларускіх тканін: Вучэбны дапаможнік / А.С. Бохан. – Мінск: БДАМ, 2006. –58 с.

## РЭЗЮМЭ

Бохан Алена Сяргееўна

**Геаметрычны арнамент традыцыйных беларускіх тканін**

**Ключавыя словы:** арнамент, геаметрычны арнамент, кампазіцыйная будова, кампазіцыйныя прыёмы, семантыка арнаменту, народнае мастацтва, традыцыйны тэкстыль, традыцыйная культура беларусаў.

**Аб'ектам даследавачня** з'яўляюцца тканы і вышываны геаметрычны арнамент традыцыйнага беларускага тэкстылю XIX – XX стст.

**Прадмет даследавання** – генезіс, семантычныя і стылістычныя асаблівасці геаметрычнай арнаментыкі традыцыйных беларускіх тканін.

**Мэта работы** – выяўленне характэрных рысаў і раскрыццё сутнасных заканамернасцяў развіцця арнаментальнай традыцыі і прынцыпаў формаўтварэння арнаментальных кампазіцый беларускага народнага тэкстылю.

**Асноўныя метады даследавання.** Метадалагічная аснова даследавання – сістэмны гісторыка-мастацтвазнаўчы падыход да вывучэння геаметрычнага арнаменту традыцыйнага беларускага тэкстылю, які дазваляе раскрыць сутнасную прыроду з'явы і прынцыпы яе развіцця. У даследаванні аўтар зыходзіў з разумення арнаменту як семіятычнай сістэмы. Таму былі разгледжаны тры асноўныя аспекты: сінтаксіс, семантыка, прагматыка. Распрацаваная аўтарам методыка вывучэння сістэмы арнаментацыі традыцыйных беларускіх тканін заснавана на метадах параўнальнага аналізу, абагульнення, тыпалагізацыі і класіфікацыі факталагічных дадзеных.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Работа з'яўляецца першым комплексным аналізам стылістыкі і семантыкі геаметрычнага арнаменту беларускіх традыцыйных тканін. Упершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве прасочана традыцыя геаметрычнай арнаментыкі беларускага тэкстылю, створана класіфікацыя элементаў арнаментальных кампазіцый. На беларускім матэрыяле геаметрычная арнаментыка тканін разглядаецца як семіятычная сістэма. Аўтарам прааналізаваны прынцыпы будовы арнаментальных кампазіцый і ўдасканалены тэрміналагічны апарат для апісання гэтай з'явы. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных адукацыйных установах гуманітарнага профілю, музейнымі супрацоўнікамі ў фарміраванні калекцый традыцыйнага мастацтва, метадыстамі ўстаноў культуры.

## РЕЗЮМЕ

Бохан Елена Сергеевна

**Геометрический орнамент традиционных белорусских тканей**

**Ключевые слова:** орнамент, геометрический орнамент, композиционное построение, композиционные приёмы, семантика орнамента, народное искусство, традиционный текстиль, традиционная культура белорусов.

**Объектом исследования** являются тканый и вышитый геометрический орнамент традиционного белорусского текстиля XIX – XX стст.

**Предмет исследования** – генезис, семантические и стилистические особенности орнаментики традиционных белорусских тканей.

**Цель работы** – выявление характерных черт и раскрытие сущностных закономерностей развития орнаментальной традиции и принципов формообразования орнаментальных композиций белорусского народного текстиля.

**Основные методы исследования.** Методологическая основа исследования – системный историко-искусствоведческий подход, который позволяет раскрыть сущность явления и принципы его развития. В исследовании автор исходил из понимания орнамента как семиотической системы. Поэтому были рассмотрены три основных аспекта: синтаксис, семантика и прагматика. Разработанная автором методика изучения системы орнаментации традиционных белорусских тканей основана на методах сравнительного анализа, обобщения, типологизации и классификации фактологических данных.

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Работа является первым комплексным анализом стилистики и семантики геометрического орнамента традиционных белорусских тканей. Впервые в белорусском искусствоведении прослежена традиция геометрической орнаментации текстиля, создана классификация элементов орнаментальных композиций. На белорусском материале геометрическая орнаментика рассматривается как семиотическая система. Автором проанализированы принципы построения орнаментальных композиций и усовершенствован терминологический аппарат для описания этого явления. Результаты исследования могут быть использованы в высших и средних специальных учебных заведениях гуманитарного профиля, музейными сотрудниками в формировании коллекций традиционного искусства, методистами учреждений культуры.

## RESUME

Bokhan Alena Sergeevna

### Geometrical Ornament of Traditional Belarusian Fabrics

**Key words:** ornament, geometrical ornament, compositional construction, compositional methods, semantics of ornament, folk art, traditional textiles, traditional Belarusian culture.

**The object of the research** is weaved and embroidered geometrical ornament of traditional Belarusian textiles of the XIX-XX centuries.

**The subject of the research is** genesis, semantic and stylistic peculiarities of traditional Belarusian fabrics ornamentics.

**The aim of the work** is discovery of `typical features and opening essential law-governed nature of development of ornament tradition and principals of ornamental compositions form formation of traditional Belarusian textiles.

**The main methods of the research.** The methodological basis of the research is the systematical historical art-critical approach, which allows opening phenomenon essentiality and principles of its development. In the research the author proceeded from understanding ornament as the semantic system. Therefore there were considered three main aspects of the phenomenon: syntax, semantics and pragmatics. Elaborated by the author methodic of study of traditional Belarusian fabrics ornamentation system is based on comparative method of analysis, generalization, typilogisation and factological data classification.

**The scientific novelty and the significance of the received results.**

The work is the first integrated analysis of stylistics and semantics of geometrical ornament of traditional Belarusian fabrics. For the first time in Belarusian art criticism the tradition of geometrical ornamentation of textile was traced, the classification of ornamental compositions elements was created. Geometrical ornamentics on Belarusian material is considered as the semiotic system. The principals of ornamental compositions construction were analyzed by the author and the term apparatus for description of this phenomenon was improved. The results of the research can be used in high and secondary special educational establishments of humanitarian profile, museum workers in forming collections of traditional art, specialists in methods in cultural establishments.